**Пачынаем абмяркоўваць артыкул: «А вы ведаеце, якімі будуць людзі будучага?»**

# А з ім у камунізм мы можам крочыць?

*Артыкул Жаны Юшкевіч прачытаў з цікавасцю, але застаўся не задаволены ім. Жана лунае ў аблаках, занадта адарвала яна свае разважанні ад жыцця і, здаецца, не з таго боку пачала сваю размову. Мы ўсе больш-менш уяўляем сабе, якімі будуць людзі будучага, уяўляем іх духоўнае аблічча, а як і ў якія адзенні яны будуць апранацца—гэта ўжо дробязі (дарэчы, рабаўладальнікі Грэцыі і Рыма таксама насілі «лёгкія і прыгожыя адзенні»). Мне здаецца, было б больш мэтазгодным пагаварыць аб маралі нашага сучасніка, аб тым, што з яе нам трэба пакінуць за бартом і з чым мы можам смела крочыць у камунізм. Хачу расказаць адзін выпадак.*

*Я даволі доўгі час сябраваў з адным са студэнтаў нашага універсітэта Барысам М. Здольны, эрудыраваны юнак любіў і разумеў музыку, захапляўся жывапісам, нядрэнна маляваў сам. І займаўся Барыс толькі на выдатна Адно ў ім было незразумелым для мяне. Барыс не прызнаваў кахання, кпіў з кожнага, хто ўздыхаў па дзяўчыне, не верыў, што можна сябраваць з імі.*

*— Э-э,—іранічна кідаў ён, — у кожнага такога, з дазволу сказаць, «сяброўства» адна падаплёка — ці ён яе прагне, ці яна яго...*

*Барыс—хлопец прыгожы. І не адна дзяўчына прыязна паглядвала на яго. Барыс ахвотна ішоў на выпадковыя лёгкія знаёмствы, пакідаў адных дзяўчат і зыходзіўся з іншымі. Але ні разу не паспрабаваў заляцацца да студэнтак з універсітэта. У яго быў нават такі дэвіз: «Нам трэба там, дзе нас не ведаюць». І сапраўды, знаёмячыся, ён называў іншае імя і прозвішча, рэдка прызнаваўся, што сам студэнт, а калі і прызнаваўся, дык называў іншую ВНУ.*

*Быў час, калі здавалася, што каханне не абмінула і Барыса. Больш месяца ён ездзіў да Тоні, студэнткі інстытута замежных моў. Трэба аддаць ёй належнае: зграбная, з мілым тварыкам, вялікімі чыстымі вачыма. Усё часцей у бібліятэцы, і ў кінс, і на танцах я бачыў Барыса разам з Тоняй. Але вось аднойчы на вечары ў інстытуце народнай гаспадаркі ён пазнаёміўся з, так званай, «стыльнай» дзяўчынай, з прычоскай «хлопчык без мамы», нафарбаванай. Хутка яны знайшлі агульную мову, і Барыс пайшоў яе праводзіць. У інтэрнат вярнуўся пад раніцу.*

*Назаўтра, калі мы ішлі ў бібліятэку, я паспрабаваў па-сяброўску пагаварыць з Барысам.*

*— Слухай, — пачаў я, — ну, навошта табе патрэбна тая... ну, твая ўчарашняя. Хіба ж яна хоць напалавіну варта Тоні?*

*Барыс са здзіўленем паглядзеў на мяне.*

*— У цябе грошы ёсць?—нечакана запытаўся ён.*

*— Ну, ёсць.*

*— Да стыпендыі хваціць.*

*— Хваціць.*

*— Значыць, ёсць яшчэ сотні дзве, — рэзюмаваў Барыс. —Ну, а калі ты зараз знойдзеш 10 ці 25 рублёў, ты іх паднімеш ці не?*

*— Ну,.. паднімў...*

*— Ну вось..,—і Барыс з выглядам пераможцы пахлопаў мяне па плячы.*

*Такі цынізм абурыў мяне, і мы ў першы раз сур'ёзна пасварыліся.*

*І ў той жа час Барыс зусім нядрэнны чалавек. Ён добры таварыш, гатовы апошнім подзяліцца з сябрам. Ён двойчы ездзіў на цаліну і працаваў так, што любадарага! Я ўпэўнены, большасць паклоннікаў Бетховена і Баха палічыць за лепшае цешыць сябе іх музыкай тут, у Мінску, а Барыс паедзе па прызначэнню, куды б яго не паслалі. А калі часам узнімецца віхура, вайны, я ўпэўнены, што ўбачу Барыса ля ваенкамата ў чарзе першых дабраахвотнікаў...*

*Ну, а як вы думаеце, ён варты жыць пры камунізме?*

**Мікалай КЛІМАЎ.**

## Усё ідзе па кругу...

**(ГУМАРЭСКА)**

—А, студсавет, добры дзень!—Валодзя Чубак прыўзняўся з ложка.—На гэты раз не можам парадаваць вас ідэальнай чысцінёй.

— Не падрыхтаваліся, так сказаць, хоць з раніцы праглі накінуцца на ўборачны агрэгат,—адазваўся з другога кута староста пакою Міша Кочкін і кіўнуў галавой на венік, які стаяў тут жа, ля ложка.

— Прашу прабачэння,—ва ўнісон ім загаварыла Света Новікава,—але і раней у вас асаблівага бляску я не заўважала.

— Такая суровая проза жыцця,—кінуў Міхаіл.

Хлопцы засмяяліся.

— І ў чым наша трагедыя, Светачка,—прыклаўшы пальцы да ілба, разважаў ён.—Графік дзяжурства згубілі.

Міша развёў рукамі. Света глядзела на яго з непаразуменнем.

— Графіка няма — парадку няма,—зрабіўшы сумны твар, заключыў Валодзя.—Тыдзень не прыбіралі. А цяпер што рабіць? Хто першы асмеліцца ўварвацца ў залежы смецця. Герой патрэбен. Тытан. А ў нас чалавечкі, сама бачыш, якія,—і ён спыніў позірк на шчуплай фігуры Жэні Сакевіча.—Паспрабуй прымусіць вось яго прыбраць. Ён, зразумела, возьмецца. Вынясе тры-чатыры вядры смецця, а потым тыдзень на занятках не паявіцца—будзе здароўе ў парадак прыводзіць. А адказваць хто? Староста наш, Міхаіл Сямёнавіч, будзе, так?

—Эх, вы..,—не вытрымала Света.—Языкі ў вас працуюць выдатна. А вось «уборачны агрэгат» стаіць. Вы б лепш венічкам, венічкам...

— Што будзем глаголіць у адказ?—падыйшоўшы да Мішы на дыбачках, запытаўся Валодзя.

Міша моўчкі падняў правую нагу і апісаў ёю круг у паветры.

— Дазвольце растлумачыць? — бачачы збянтэжаны выгляд Светы, звярнуўся Валодзя да Кочкіна.

— Дазваляю,—кіўнуў Міша.

— Гэты мудры і лаканічны жэст, наважаная Света, азначае, што ўсё ідзе па кругу. Дакруціцца кола падзей да пэўнай кропкі—пачнём уборку. Правільна я гавару, арлы?!—звярнуўся ён да хлопцаў.



— Зусім правільна,—вырвалася з пяці глотак.

— Я, дарэчы, прыйшла да вас не парадкам у пакоі любавацца.., — пачала Света.

— Можа грошай пазычыць прынесла,—ветліва пацікавіўся Коля Бягуновіч.

— Не. Сёння па графіку Кочкін і Чубак мыюць падлогу на паверсе. Я зайшла папярэдзіць, што ваша чарга...

— Так хутка?—зрабіўшы кіслую грымасу, працягнуў Міша.

—Усё ідзе па кругу,—усміхнулася Света.—Анучы і швабры, паважаныя аратары, пад лесвіцай. Мыць, як належыць! Да пабачэння!

— Вось табе і на, значыць, кіно цю-цю,—уздыхнуў Валодзя, як толькі зачыніліся за Светай дзверы 45 пакоя.

— Не сумуй, добры молайца,—пагладзіў яго па галаве Міша.—Мастацтва патрабуе ахвяр. Памыем пасля кіно.

— А паспеем? Кіно ж а першай гадзіне ночы заканчваецца.

— Запраста, Вовачка, запраста,—загаварыў Міша.—Па-першае, мыць лепш—ніхто не швэндаецца, не перашкаджае. А, па-другое, — ён хітра падміргнуў таварышу,—прадукцыйнасць павялічыцца за лік... А, між іншым, пасля ўбачыш. А цяпер апранайся!

... А другой гадзіне ночы ў апусцеўшым калідоры з тазам анучамі і швабрамі паявіліся Міша і Валодзя.

— Заўтра на заняткі к васьмі..,—сказаў Валодзя і ва ўвесь рот пазяхнуў.

— Калі ты яшчэ раз пазяхнеш,—абапёршыся на шчотку, марудна загаварыў Міша,—я пашыю табе наморднік за ўласны кошт. Твая санлівая фізіяномія і так падрывае мае маральныя ўстоі.

Валодзя папрасіў прабачэння і, нагнуўшыся, пачаў згортваць дарожку.

— Ты што робіш?—запытаўся Міша.

— Як што?—здзівіўся Валодзя.—Дарожку ж трэба згарнуць.

— Дурань...,—прастагнаў Міша.—Ды зразумей ты, што без прымянення скарасных метадаў мы тут да раніцы корпацца будзем.

— Выкладай свае метады!

— Па-першае, пакінь дарожку ў пакоі. Ужо адну трэцюю частку падлогі мыць не трэба. Зразумеў? Па-другое, падлогу па абодва бакі дарожкі будзем мыць у тэмпе «бліц».

Міша хутка наматаў на швабру вялікую анучу, намачыў яе ў тазіку з вадой і, прыціснуўшы да дошак, паімчаўся ўздоўж калідора, пакідаючы за сабой мокрую паласу.

— А падмятаць!—залямантаваў услед яму Валодзя.—Падмесці ж хоць крыху трэба.

— Часу няма, часу,—на хаду крыкнуў Міша і, завярнуўшыся, панёсся ў другі бок. З 35 пакою высунуліся рыжыя касманы, і сонны голас запытаўся: «Ты што, Булатава пераскочыць хочыш?».

— Здымі акуляры, мілейшы. Ідзе ўборка паверха,—прабягаючы паўз дзверы, агрызнуўся Міша.

— Здорава, праўда?—запытаўся ён, падбегшы да Валодзі. — Вось што значыць тэхніка ва ўмелых руках. Нават пыласос «Ракета» выглядае нікчэмнай жалезкай у параўнанні з гэтай шваброй.

— Тэмп выдатны, але ж смецце застаецца. Глядзі, вунь акуркі і запалкі ў вадзе плаваюць, — плакаўся Валодзя.

— Кожны ў чымсьці плавае. Уперад, Вовачка! Вымыем новыя квадратныя метры падлогі! — усклікнуў Міша і, добра намачыўшы анучу, паімчаўся уперад. У процілеглы бок ірвануў Валодзя. Затым Міша выклікаў яго на спаборніцтва, і тэмп работы яшчэ ўзрос.

А раніцай Света выйшла з пакою, зірнула на падлогу і ахнула. Пратуберанцы высахшага бруду ўтварылі на ёй разнастайныя мудрагелістыя ўзоры. І, як адзіны ўспамін аб скарасным метадзе, па ўсёй падлозе чарнелі сляды Кочкіна і Чубака, якія зыходзіліся ля дакладна вызначанага круга на падлозе, дзе, відаць, стаяў тазік.

Калі ў 45-ы пакой увайшла Света, старшыня студкома і камендант інтэрната, Міша і Валодзя яшчэ спалі. А яшчэ праз 20 мінут з усіх сіл разнімаючы цяжкія павекі, яны зноў стаялі ля тазіка з вадой.

— Згортвай дарожку, я буду падмятаць,—буркнуў Міша.

— Усё ідзе па кругу,—уздыхнуў Валодзя.

**А. РАДУЦКІ.**

## ВЫСТАЎКА ТВОРАЎ ЮБІЛЯРА

**У бібліятэцы нашага універсітэта арганізавана кніжная выстаўка, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Міхася Лынькова. На стэндзе экспануюцца чатыры тамы яго славутай эпапеі «Векапомныя дні», зборнікі апавяданняў і творы ў перакладзе на рускую мову. Тут таксама выстаўлены манаграфіі, рэцэнзіі і артыкулы аб творчасці пісьменніка.**

**Такія ж выстаўкі наладжаны ў бібліятэцы юрыдычнага факультэта і кабінеце беларускай літаратуры.**

**В. ДЫМОЎСКІ.**



**6 СНЕЖНЯ адбудзецца першынство універсітэта па цяжкай атлетыцы. Праходзяць апошнія трэніроўкі. Вынікі другога разраду паказвае студэнт IV курса юрыдычнага факультэта Валерый Павецьеў.**

**НА ЗДЫМКУ: Валерый Павецьеў штурхае штангу вагой у 90 кілаграм.**



Набліжаецца сесія. З кожным днём усё менш свабодных месц застаецца ў чытальных залах, лабараторыях. Кожны імкнецца выканаць усе работы да сесіі.

НА ЗДЫМКУ: уважліва запісвае паказанні прыбора Людміла Іванькова, студэнтка III курса фізфака.

Фото А. ШРУБКА.

## КОРАТКА

**☆ Адбылося ўшанаванне дэкана біялагічнага факультэта, кандыдата біялагічных навук дацэнта Паўла Рыгоравіча Пятровіча ў сувязі з 50-годдзем з дня яго нараджэння і 30-годдзем грамадскай і навукова-педагагічнай дзейнасці. Выкладчыкі, студэнты і супрацоўнікі універсітэта выступілі з віншавальнымі прамовамі. Юбіляру былі ўручаны падарункі і прывітальныя адрасы.**

**☆ 13 студэнтаў нашага універсітэта з'яўляюцца членамі лектарскай групы Мінскага абкома ЛКСМБ. Нядаўна адбыўся семінар маладых прапагандыстаў вобласці. У ім удзельнічалі студэнты Зеляніцкі, Галайша, Старавойтаў і іншыя актыўныя лектары.**

**☆ На біялагічным факультэце адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная стагоддзю з дня выхаду ў свет геніяльнай працы Ч. Дарвіна «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору». На канферэнцыі з навуковымі дакладамі выступілі вучоныя-прыродазнаўцы і студэнты.**

**☆ На факультэтах адбыліся справаздачна-выбарчыя сходы камітэтаў ДТСААФ. Прыняты пастановы па паляпшэнню работы абаронных таварыстваў і выбраны новыя камітэты.**

**☆ У нашым клубе адбылася рэспубліканская нарада загадчыкаў спартыўных кафедраў навучальных устаноў, дзе разглядаліся пытанні новага праекта праграмы фізвыхавання ў ВНУ і зацверджанне календара спартыўна-масавых мерапрыемстваў на 1960 год. Прадстаўнік кафедры фізвыхавання нашага універсітэта тав. Я. Г. Маркаў выказаў шэраг заўваг і прапаноў па абмяркоўваемых пытаннях.**

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

**Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19.**

АТ 10838. Зак. 1828. **Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна** Тыраж 2000 экз.